ЛИТЕРАТУРА:
1. Адаптация // Биология. Современная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gufo.me/dict/biology_modernenc/ %D0%B0%D0%B4%D0%B0%D0%BF%D1%82%D0%B0%D1%86%D0%B8%D1%8F . – Дата доступа: 14.10.2022.
2. Адаптация физиологическая // Большая российская энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https:// bigenc.ru/biology/text/1799995#. – Дата доступа: 14.10.2022.
3. Социокультурная адаптация // Педагогическая энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://didacts.ru/termin/sociokulturnaja-adaptacija.html. – Дата доступа: 14.10.2022.
4. Ширкова, Н. Н. Педагогическое обеспечение социокультурной адаптации иностранных студентов: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / Н.Н. Ширкова. – М., 2017. – 228 с.
5. Русский язык как иностранный. Лексико-грамматический курс : пособие по развитию устной и письменной речи для студентов факультета иностранных учащихся с английским языком обучения (специальность 1-79 01 01 «Лечебное дело») / А. В. Сентябова [и др.] ; под общ. ред. Е. П. Пустошило. – Гродно : ГрГМУ, 2019. – 479 с.
6. Вальченко, И. В. Интересные истории: пособие для чтения / И. В. Вальченко, Т. А. Плотникова, Г. П. Соколова; [под ред. Г. П. Соколовой] ; Харьков. нац. ун-т гор. хоз-ва им. А. Н. Бекетова. – Харьков: ХНУГХ им. А. Н. Бекетова, 2015. –132 с.

# ИНОСТРАННЫЕ ЯЗЫКИ И МЕТОДИКА ИХ ПРЕПОДАВАНИЯ

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ КУРАТАРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў АРГАНІЗАЦЫЯХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

**Божка Т. В., Шыдлоўская В. У.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

Апошнім часам назіраецца ўзрастанне ўвагі да праблем выхавання, адаптацыі і сацыялізацыі студэнтаў, аб чым сведчыць змест адукацыйных стандартаў, асноўных адукацыйных праграм, нарматыўных дакументаў вну.Так, напрыклад, адной з асноўных мэт дзяржаўнай праграмы РБ «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021–2025 гады з’яўляецца: «узмацненне прафесійнага патэнцыялу моладзі і яе ўключэнне ў грамадска-карысную дзейнасць, падтрымка дзіцячай творчасці» [гл.: 1]. Прыярытэтным прызначэннем сістэмы адукацыі з’яўляецца фарміраванне асобы, якая сацыяльна і прафесійна кампетэнтная, здольная да творчага пошуку, адказнай і творчай.Пошук новых падыходаў да выхавання ў адукацыйных установах прыводзіць да неабходнасці звароту да сістэмнага падыходу, даследавання ролі і магчымасцей суб’ектаў, якія яго рэалізуюць, у тым ліку педагога-куратара.Немалаважную ролю тут адыгрывае інстытут куратарства, дзейнасць якога спрыяе развіццю кампанентнага складу універсальных і прафесійных

Репозиторий ГрГМУ

кампетэнцый у студэнтаў: прафесійных кампетэнцый (арыентацыя на работадаўца); універсальных кампетэнцый (камунікацыя, індывідуальная і камандная работа, прафесійная этыка, сацыяльная адказнасць, навучанне на працягу ўсяго жыцця).

Найбольш поўнае азначэнне тэрміна «куратар студэнцкай групы», на нашу думку, прапануе Л. М. Васільева: «чалавек, які ажыццяўляе выхаваўчую дзейнасць у вну, з’яўляецца духоўным пасярэднікам паміж грамадствам, прафесіяй і студэнтам у засваенні агульнай і прафесійнай культуры, які арганізуе сістэму каштоўнасных адносін праз разнастайныя віды дзейнасці студэнцкага калектыву, які стварае ўмовы развіцця кожнай асобы, які абараняе інтарэсы студэнтаў» [2, с. 8].

Для паспяховай арганізацыі і ажыццяўлення куратарскай дзейнасці неабходна выкананне педагагічных умоў, якія ў навуковых даследаваннях вызначаюцца наступнымі пунктамі:

1. актуалізацыя каштоўнасных адносін педагагічнага калектыву адукацыйнай установы да выхаваўчай работы са студэнтамі;

2. замацаванне норм дзейнасці супольнасці куратараў у распрацаванай і рэалізуемай педагагічным калектывам адукацыйнай установы нарматыўна-арганізацыйнай базе;

3. удасканаленне прафесійна-педагагічнай кампетэнтнасці куратара праз спалучэнне псіхолага-педагагічнага спецкурсу, спецыяльна арганізаваных рэфлексіўна-ацэначных працэдур і практычнай дзейнасці са студэнтамі;

4. стварэнне і рэалізацыя куратарамі ўзаемасувязі і ўзаемаўплыву кампанентаў выхаваўчай сістэмы ў шматфункцыянальным і шматстайным выхаваўчым асяроддзі вну [3, с. 242].

У рабоце са студэнтамі важныя не толькі педагагічныя ўмовы, але і стаўленне і ўсведамленне куратарам сваёй дзейнасці. Адпаведна, у план работы куратара акадэмічнай групы мэтазгодна ўключыць:

– збор розных звестак аб студэнтах;
– азнаямленне студэнтаў з арганізацыяй вучэбна-выхаваўчага працэсу ў вну;
– знаёмства з нарматыўнымі дакументамі вну (Закон аб адукацыі, Статут універсітэта, Правілы ўнутранага распарадку), а таксама палажэннямі аб стыпендыяльным забеспячэнні, бягучым кантролі і інш.
– садзейнічанне ў адаптацыі студэнтаў да сістэмы навучання вну (на 1 курсе);
– наведванне мерапрыемстваў, дзе ўдзельнічаюць студэнты з падкантрольных груп;
– устанаўленне кантакту паміж адміністрацыяй, грамадскімі арганізацыямі (прафкам), вучэбным персаналам вну і студэнтамі групы;
– кантроль паспяховасці і дысцыпліны групы;
– прыцягненне студэнтаў да навукова-даследчай, грамадскай, спартыўнай, культурна-творчай дзейнасці інш.

Репозиторий ГрГМУ

Акрамя цесных і бесперапынных сувязяў куратара з групай, неабходным з'яўляецца ўзаемадзеянне з дэканатам у мэтах выяўлення, напрыклад, акадэмічных запазычанасцяў і інш. Праца куратараў павінна рэгулярна абмяркоўвацца на паседжаннях кафедры і саветах факультэта. Згодна з планам, можна адсочваць эфектыўнасць работы куратараў і па выніках навучальнага года распрацоўваць метадычныя рэкамендацыі і сістэмы стымулявання.

Згодна з нарматыўнымі дакументамі, дзейнасць куратара ў сучаснай вну павінна грунтавацца на наступных прынцыпах: адпаведнасць выхавання патрэбам асобы, грамадства і дзяржавы; прыярытэтнасць агульначалавечых духоўных каштоўнасцей у фарміраванні будучага спецыяліста; фундаментальнасць прафесійнай падрыхтоўкі; цэласнасць; гуманістычная накіраванасць у фарміраванні асобы як дастойнага грамадзяніна; дэмакратызм; інавацыйнасць; адкрытасць дасягненням навукі, культуры і адукацыйнай практыкі [гл.: 4].

У заключэнне абагульім змест асноўных палажэнняў аб значнай ролі куратарства ў сучаснай вышэйшай адукацыі: яна садзейнічае эфектыўнаму фарміраванню студэнтаў як асоб з высокім пачуццём адказнасці, здольных да актыўнай прафесійнай і паспяховай жыццядзейнасці, накіраваных на прафесійную самарэалізацыю, самавызначэнне, саманавучанне на працягу ўсяго жыцця; садзейнічае асобаснаму росту і самарэалізацыі студэнтаў праз развіццё прафесійных і ўніверсальных кампетэнцый; аказвае псіхолага-педагагічную падтрымку праз стварэнне спрыяльных сацыяльна-сіхалагічных умоў і сацыякультурнага адукацыйнага асяроддзя.

ЛІТАРАТУРА:

1. Постановление совета министров республики Беларусь 29 января 2021 г. № 57 О Государственной программе «Образование и молодежная политика» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100057&p1=1. – Дата доступа: 13.10.2022.

2. Горшкова, М. А. К вопросу о роли куратора в воспитательном пространстве вуза / М. А. Горшкова // Вестник общественных наук. – 2019. –№3. – С. 241–246.

3. Васильева, Л. М. Педагогические условия повышения квалификации кураторов студенческой группы в колледже: автореф. дис. канд. пед. наук : 13.00.02 / Л. М. Васильева. – Ставрополь, 2018. – 23 с.

4. Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 26.04.2006 № 41 Об утверждении Инструкции об организации работы куратора студенческой группы высшего учебного заведения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.bsmu.by/downloads/otdeli/vospitanie/2017/instr_kuratora.pdf. – Дата доступа: 13.10.2022.

Репозиторий ГрГМУ